Уладзімір Някляеў

# Чмель і вандроўнік

## *Прыпавесьць*

*На саракавіны В.Б.*

Чмель паміраў. Так сталася, што пад дзень нараджэньня.

Ён быў мудрым чмялём — і ведаў, што рыбы, птушкі, зьвяры і ўсё, што нараджаецца, і людзі, памірае, і кветкі, і таму, мусібыць, і чмялі, але ня ведаў, як, і што пасьля, і трохі баяўся...

Таму яму падумалася, што ёсьць чмяліны Бог.

Ён быў мужным і моцным чмялём, жыў невыносна доўга і не стаміўся невыносна доўга жыць, аблётаўшы ці ня ўвесь чмяліны сьвет і яшчэ схадзіўшы на вайну. Вайна была вялікай, але ня большай за сьвет, і ён зьдзівіўся.

І яшчэ зьдзівіўся, што яна, вайна, яму не замінала.

“Тады што ж, — ён падумаў, — можа замінаць?..” І выходзіла, што нічога.

Адна сьмерць.

“Але ж ня можа яна, сьмерць, — ён думаў, — быць большай за жыцьцё?.. Як вайна ня можа быць большай за сьвет”.

Мудрасьці, каб падумаць інакш, не хапіла. Ён зразумеў, што ў тым, пра што падумаў, няма мудрасьці. “Тады дзе яна і ў чым?...”

Выходзіла, што, калі ня ў ім, у чмялі, тады ў чмяліным Бозе.

Тут узьнікала праблема: пра тое, што ёсьць Бог, падумалася, але веры ні ў чмялінага, ні ў якога іншага Бога ў чмялі не было.

Бог, які быў у чмялі, думаў: што рабіць з чмялём? Да Бога чмель, хоць Бог быў у ім, так і не дабраўся, пастанавіўшы, што Бога няма, а ёсьць толькі жыцьцё, вайна і сьмерць. Але зямны свой наканаваны шлях чмель прайшоў прыстойна. Больш прыстойна, чым многія і многія з тых, хто верыў, што Бог ёсьць. У Бога ўзьнікала праблема...

Праз тры сьцяны ад чмяля паміраў у тым жа шпіталі ад той жа хваробы авадзень. Ён быў такім аваднём, пра якога і сказаць, і падумаць можна хіба толькі тое, што ён авадзень. І ўсё ж ў ім хапала аваднёвага розуму, каб дапяць, што, хоць ён і авадзень, але, калі паміраюць птушкі, рыбы, чмялі, дык, мусіць, памрэ і ён. Яму было гэтак страшна, што ён толькі прасіў і прасіў, маліў і маліў Бога, каб ня даў памерці.

Бог, які быў у чмялі, паклікаў да чмяля вандроўніка, якога чмель некалі ўджаліў. Вандроўнік крыўдаваў на чмяля і ня надта хацеў ісьці. Але за гады вандроўніцтва ён зрабіў крок да Бога, таму пайшоў, куды Бог паклікаў.

Па дарозе ў вандроўніка ўзьнікла праблема: з чым прыйсьці да таго, хто памірае? І ў каго заўтра дзень нараджэньня. Што прынесьці ў падарунак? Залаты гадзіньнік?..

На рынку да вандроўніка падышла бабуля ў белым і падала суніцы на сунічніку. Маленькі букецік з чырвонымі ягадамі. “Табе гэта?..” — спытала бабуля, і вандроўнік успомніў, што аднойчы хадзіў з чмялём у суніцы. Пакуль ён шукаў па кішэнях, каб разьлічыцца, грошы, бабуля павярнулася і хуценька пайшла. Вандроўнік кінуўся яе даганяць, бубуля давяла яго да крамы з кветкамі і ў кветках прапала.

---

Прыпавесьць друкавалася ў тыднёвіку «Наша ніва» ў 2003 годзе.

Квятнярка спытала: “Вам колькі?”

Вандроўнік ня ведаў, колькі... Пяць? Сем? Сто?

Квятнярка стаяла на парожку сваёй крамы, зрабіла крок уніз, абступілася і, каб ня ўпасьці, ухапілася за безьліч руж, выхапіўшы з іх адну. Знайшла раўнавагу і ня ўпала.

Вандроўнік купіў адну тую белую ружу і паехаў у шпіталь. Дарогай, каб заняць час, думаў пра тое, як хораша ўсё ён прыдумаў. З суніцамі, з ружай...

Авадзень, баючыся, што Бог пра яго ня ўсё помніць, нагадваў Богу, як аднойчы поп з той вёскі, дзе нарадзіўся авадзень, папрасіў яго, авадня, дапамагчы збудаваць царкву, і як ён, авадзень, пастараўся. Тэхніку загадаў прыгнаць, цэглу і цэмент завезьці, і нават золата на пазалоту... І як поп яму дзякаваў і бажыўся, што ўсе грахі яму, авадню, за тое будуць адпушчаныя.

Яшчэ авадзень нагадаў Богу, што падаваў міласьціну. Часта, амаль заўсёды, калі здаралася напаткаць жабрака альбо жабрачку. Хіба Бог таго не заўважаў?..

У палату ўвайшоў доктар. Авадзень ня ведаў яго, першы раз бачыў. Доктар падышоў да вакна, якое само расчынілася, і сказаў у вакно: “Храмы, што будуюцца не са свайго, не стаяць. Міласьціна, якая падаецца дзеля сябе, не ратуе”.

Авадзень хацеў нешта спытаць, але ня ведаў што і не знайшоў у каго. У расчыненае вакно ўлящела парушынка, і зазірнула пустата.

На калідоры каля палаты, у якой паміраў чмель, сядзеў сьвятар. Ён прыходзіў і сядзеў тут штодня ўжо тыдзень, чакаючы, калі чмель яго пакліча, каб далучыцца да Бога праз таямніцу споведзі. Чмель ня клікаў...

— Як сёньня?.. — спытаў сьвятар доктара, і доктар паціснуў плячыма.

Чмель адчуваў у сабе — там, дзе тое, што звычайна называюць душой — нязвыклы рух, нейкі такі, нібы ў ім, у чмялі, яшчэ адзін чмель і ўніз, і ўверх, і адразу ва ўсе бакі лятае, і стаў ціха да руху, да сябе ў сабе самім прыслухоўвацца: ці не пачуецца выразны гук?.. Але не: рух быў як адразу ўверх і ўніз і ва ўсе бакі — так адразу ва ўсім, няўцямны ў сабе самім, і ў ім яшчэ нешта было і яшчэ нешта...

“А можа быць... “ — падумаў чмель — і далей ня стаў пра гэта думаць, падлавіўшы сябе на слабасьці.

Вандроўнік згадаў, як везьлі яго аднойчы гэтай дарогай — туды, дзе паміраў зараз чмель. Як правозілі на машыне хуткай дапамогі міма гарадскіх бальніцаў — і як ён кожнага разу спадзяваўся, што вось да гэтай бальніцы, не далей, і як у ім сьціналася ўсё, калі далей і далей, і ўрэшце да самай дальняй, у якую кладуць з той хваробай, ад якой амаль непазьбежна канаюць, і як ён ня мог выйсьці, калі давезьлі, з машыны, так абліўшыся ўспацелым страхам, нібы да ніткі вымак пад дажджом.

Аўтобус, у якім ехаў вандроўнік, раптам ссунуўся на абочыну, і яго пачалі абганяць машыны: з сірэнамі, з міргалкамі — на шалёнай хуткасьці адна, другая, дзясятая, адна за адной... Чмель займеў славу ў чмяліным сьвеце, але ў Айчыне сваёй быў біты камянямі, і вандроўнік падумаў у зьдзіўленьні: “Няўжо да чмяля?.. “ Гледзячы ў пыл, узьняты машынамі, ён успомніў, як прагнуў гэтага пылу, за што чмель яго і ўджаліў.

Чмель успомніў пра вандроўніка, калі ў падворак шпіталю пачалі ўкочвацца машыны: з сірэнамі, з міргалкамі — адна, другая, дзясятая, адна за адной... Чмель не чакаў, што яны да яго, ён наогул нікога не чакаў — і вандроўніка, пра якога ўспомніў. Толькі падумаў: “Чаму?..”

Увайшоў доктар і зачыніў вакно: “Я сказаў ім, што сюды на машынах нельга, але яны ўсё адно панаехалі”.

“Хто яны?..” — спытаў чмель, і доктар адказаў, выходзячы: “Я ж кажу: машыны. Да авадня”.

Перш, чым зайсьці да чмяля, вандроўнік зазірнуў да доктара. Спытаў, калі чмель памрэ?..

Доктар сказаў, што, можа, сёньня. А, можа, дні праз тры.

— Ён баіцца? — спытаў вандроўнік.

— Усе баяцца, — адказаў доктар. — Але хто як.

Вандроўнік папрасіўся ў доктара пераседзець крыху ў яго. Падумаць, як да чмяля ўвайсьці, павітацца, што сказаць... Доктар сказаў: “Ён можа памерці зараз”.

На калідоры вандроўніка пераняў сьвятар.

“Скажы яму, каб паклікаў мяне, — з мальбою папрасіў сьвятар вандроўніка. — Скажы, бо ён не разумее...”

Вандроўнік падумаў, што чмель ня можа не разумець, і сказаў сьвятару:

“Ён ня можа не разумець”.

— Вы даўно ў суніцы не хадзілі... — падышоў вандроўнік да ложку, на якім паміраў чмель. Той узяў сунічнік, сарваў ягаду, раскусіў — і з куточку роту пакацілася, пакідаючы сьлед на белай бальнічнай шчацэ, на падбародку, сунічная крывінка.

— Праўда... даўно... — даўка пракаўтнуў чмель, а вандроўнік ня ведаў, што рабіць з крывінкай: выціраць ці не?.. Паглядзеў на жонку чмяля, руплівую пчалу — тая займалася ружай, ставіла яе ў вазу.

— Вытрыся, — сказала пчала чмялю. Той выцерся, паклаў каля сябе сунічнік і паглядзеў на ружу.

— Колькі і чаго кожнаму трэба?.. — спытаў чмель не ў пчалы і не ў вандроўніка. І адказаў ня ім. — Адно жыцьцё, адна сьмерць, адна кветка...

Вандроўніку стала ніякавата. Да сораму. Усё, што ён так і столькі прыдумляў, за што сябе хваліў, чмель раскусіў за імгненьне, як ягаду. Таму вандроўнік сказаў тое, што не сказаў бы, калі б яму ня стала ніякавата. Да сораму.

— Даруйце, што змусіў вас некалі мяне ўджаліць.

Чмель павярнуў сівую галаву на высокай падушцы і ўтаропіўся ў сьцяну. Доўга глядзеў у сьцяну і маўчаў. Пакуль ня выдыхнуў праз сілу, як выціснуў з сябе:

— Дзякуй.

Усё было сказана, больш між імі не было нічога... Вандроўнік прыпадняўся, каб пацалаваць чмяля і пайсці, але чмель спыніў яго, узяўшы за руку.

— Пачакай... я ня ведаю...

Вандроўнік разгубіўся, бо таксама ня ведаў. Толькі здагадваўся. І яму здавалася, што чмель ведае... Павінен ведаць.

— Пра што вы там? — занепакоілася пчала, і ў дзьверы зазірнуў доктар, паклікаў яе, нечым заняў.

Вандроўнік глядзеў чмялю ў вочы, бачыў там сьмерць і ня цяміў, што рабіць... Бог, які прывёў вандроўніка, падказаў: “Скажы яму, што сьмерці няма”.

“Я іншым разам чую галасы, — стаў казаць вандроўнік тое, што падказваў Бог, — і ўчуў аднойчы голас дзеда: “Прыязджай...” Я далёка быў і ехаў доўга, да таго ж многа гадоў мы ня бачыліся, а дзед спаткаў мяне ў падворку так, нібы я на хвіліну да суседзяў зьбегаў. Кіўнуў на дрывотню:

— Набяры бярэмя і паднясі ў лазьню.

— Гэта калі было? — нечакана спытаў чмель, і вандроўнік адказаў, што зімой, і ён наскрозь прамерз, пакуль дабраўся.

Чмель сказаў: “Зараз лета...” Болей нічога ён не пытаўся, і вандроўнік, пачакаўшы, стаў казаць далей.

— У лазьні я трохі папарыў дзеда, памыў, ён апрануўся ў белае сподняе — і мы селі ў сенцах. Дзед паклаў на лаву скібку сала, акраец хлеба, паставіў гарнец самагонкі, кілішкі... Калі я наліў, ён падняў кілішак і сказаў ціха, звычайна:

— Дзякуй, што прыехаў. Сёньня ўночы я памру.

Вандроўнік замаўчаў, спалохаўшыся прамоўленага, але ні чмель, ні Бог яго не спынілі. Чмель глядзеў і чакаў...

— Дзед, ты што! Мы сто разоў з табой яшчэ вып’ем! — пачаў я абдымаць і цалаваць дзеда, і ён сядзеў іківаў: “Добра... добра...”

Ідучы ў хату, дзед прыпыніўся каля драбіны на гарышча. Сказаў: “Злазь. Там у куце пад самай страхой стаіць куфэрачак, вазьмі яго”.

Я злазіў і ўзяў. Зялёны куфэрачак з пацёртым медным замочкам.

У хаце дзед адамкнуў куфэрачак і дастаў тое, што ў ім было. “Евангельле” і “Урок Закону Божага”. Сказаў: “Па адной кнізе я вучыўся жыць, па другой жыў. Больш мне няма чаго табе пакінуць”.

Куточак роту, з якога выкочвалася сунічная крывінка, торгнуўся ў чмяля, і вандроўнік зрабіў паўзу...

— Дзед хадзіў на вайну? — спытаў чмель.

— Так. Са Сьвятым Пісаньнем.

Чмель зірнуў недаверліва.

— Не на вашу вайну, — сказаў вандроўнік. — На тую, якая была перад вашай.

Чмель кіўнуў.

— У хаце, апроч мяне і дзеда, дыхала шмат людзей: дзед склікаў усіх сваіх сыноў і дачок з іх дзецьмі, але не сказаў ім: нашто? Яны думалі, што на дзень нараджэньня, які павінен быў настаць заўтра, — і ўсе спалі на чыстай палавіне, позна ўжо было. Ложак дзеда стаяў на чорнай палавіне — каля печы, саганоў, карыта з паранкай...

Чмель слаба ўсьміхнуўся:

— Выпіхвалі старога. Звычайная рэч...

— І ў галаве вісеў абраз, пад якім ён папрасіў мяне, лёгшы і склаўшы рукі, запаліць сьвечку. Я запаліў і падаўся спаць у бакоўку, дзе ня мог заснуць, падняўся, каб пайсьці ў двор пакурыць, выйшаў на чорную палавіну — і дзед на маіх вачах заплюшчыў вочы, усьміхнуўся і памёр. І адразу ж пагасла сьвечка.

Паўза ўзьнікла сама па сабе, і чмель спытаў вандроўніка:

— Табе стала страшна?

— Не, — адказаў вандроўнік. — Мне стала сьветла. Я ня бачыў столькі сьмерцяў, як вы, але ўсё ж некалькі бачыў, і там было страшна, а тут — сьветла. Толькі я ня ведаў, што мне з гэтым рабіць, і зноў схаваўся ў бакоўку. Там скурчыўся, скруціўся, як у дзяцінстве, падціснуўшы калені, і пачаў маліцца. Стаў маліць дзеда, каб пра тое, што я толькі што ўбачыў, ён мне яшчэ і расказаў. Ці неяк паказаў, давёў, што так яно і ёсьць, хоць я разумеў, што нельга... але дзед, дзед, я маліў, я так цябе любіў, ты так мяне любіў, дык скажы, што так ёсьць, хоць адтуль казаць нельга... але ты сьвяты, табе даруецца, а мне так трэба ведаць...

Чмель сьціснуў руку вандроўніка трохі мацней.

— З той малітвай, з тою просьбай, павярнуўшыся на сьпіну і склаўшы, як дзед, рукі, я раптам адчуў сябе не адным. Узьняўся над сабой самім і ўбачыў сябе самога ў бакоўцы, дзе ляжаў на тапчане, склаўшы рукі — выразна сябе

ўбачыў, усяго да драбніцаў, хоць там, дзе я ляжаў, было цёмна, і той я, якога я сябе ўбачыў, мне ня глянуўся, не спадабаўся, і я з радасьцю, з пранізьлівым шчасьцем адчуў сябе другім, зусім іншым, лёгкім, бязважкім — і там, дзе я быў такім, было сьветла, так сьветла, як скрозь і ўва мне адно сьвятло. Шчасьлівым сьвятлом у тым сьвятле я выплыў з бакоўкі, праплыў па чыстай палавіне над сваёй маці, якая спала і ўсьміхалася ў сьне, над сваім бацькам, над усімі роднымі, блізкімі, крэўнымі мне людзьмі, пра якіх думаў, як страшна будзе іх пакідаць, як яшчэ страшней будзе, калі нехта з іх мяне пакіне, а тут адчуў, што не, зусім ня страшна, і яшчэ адчуў, што хачу пакінуць іх як найхутчэй, зараз — і мяне неадольна пацягнула ў адчыненую фортку, бо ў хаце было душна і трэба было дыхаць, а за форткай было так высака і прасторна і дыхаць ня трэба было, бо ты сам, як дыханьне, так, як дзіцячае дыханьне, і калі я рвануўся ў фортку, пераўтвараючыся ў дыханьне і набіраючы і набіраючы сьвятла, убачыў за форткай дзеда, які таксама — адно дыханьне і сьвятло, і дзед прадыхнуў: “Тут ня цёмна, ты ня бойся...” “Дзед!” — кінуўся я да яго, каб маліць, каб заклінаць, каб ён узяў мяне з сабой — і знайшоўся ў самім сабе ў бакоўцы, дзе ляжаў, склаўшы рукі, на тапчане. Усё скончылася, але ў цела сваё, якое яшчэ трэба былоданошваць, я вярнуўся іншым. Не нашмат, ня гэткім, як сьвятло і дыханьне, але і не такім, якім сябе пакідаў... Я дзеда так любіў, ён так мяне любіў, што прыадкрыў таямніцу: сьмерці няма. Няма сьмерці.

Чмель адпусьціў руку вандроўніка, усьміхнуўся і сказаў:

— Дзякуй. А то там сьвятар сядзіць і сядзіць...

— Але гэтага мне мала было, — доўжыў вандроўнік. — Толькі аднаму гэта ведаць было мала, хацелася, каб і маці ведала, і бацька, і ўсе, каго я любіў... І я ўсіх пабудзіў, сказаў, што дзед памёр, і стаў глядзець, што яны стануць рабіць, і калі яны кінуліся ў сьлёзы і крык, загаласілі: а на каго ж ты нас пакінуў? — я ўзмаліў: дзед, падай ім знак, што яны не пра тое плачуць, крычаць і галосяць! — і дзед сарваў са сьцяны зашклёны абраз, пад якім памёр, узьняў яго і гвазгануў аб падлогу, шкло ў галашэньне і сьлёзы пырскамі разьляцелася: “Сьціхніце! Сьмерці няма!..”

— Абраз гвазгануў?.. — напружана ўгледзеўся ў вочы вандроўніка чмель.

— Абраз.

— Пад якім памёр?..

— Пад якім памёр.

— Нахіліся да мяне... — паспрабаваў прыпадняцца чмель і, калі вандроўнік нахіліўся, вышаптаў яму на вуха. — Зрабі так, каб як найцішэй было, калі стану дыханьнем. Пастараешся?..

— Пастараюся, але так ня будзе, — адказаў вандроўнік. — Вы самі ведаеце...

Чмель сказаў:

— На жаль...

Вандроўнік папрасіўся:

— Я пайду?..

— Ідзі... І вяртайся дахаты, — пацалаваў яго чмель. — Доўгім ці кароткім шляхам, але вяртайся.

— Я вярнуся, — сказаў вандроўнік. — Доўгім ці кароткім... — І не дагаварыў, пра нешта падумаўшы.

Бог сказаў: “Кароткага шляху не бывае”.

Чмель пачуў. Памаўчаў і кіўнуў, лежачы: “Гэта так”.

Вандроўнік рушыў да дзьвярэй, у якіх чмель спыніў яго.

— Чакай. Апошняе... Скажы ім, што хачу памерці ў сваім ложку.

— А самі вы...

— Казаў. Ня чуюць... Баяцца, што памру.

Вандроўнік кіўнуў і выйшаў.

— Ну што?.. — кінуўся на калідоры да вандроўніка сьвятар, і вандроўнік зманіў:

— Не разумее.

— Ён хоча памерці ў сваім ложку, — сказаў вандроўнік доктару, і той адказаў:

— Ведаю.

— Тады чаму не?..

— Бо ён штучна жыве. I калі я адключу яго ад штучнага жыцьця, памрэ ці імгненна, ці па дарозе ў машыне. Што мне рабіць?..

Вандроўнік павагаўся і сказаў:

— Адключы. Ён не памрэ па дарозе.

Доктар бясьсільна разьвёў рукамі:

— Я доктар. I чужы, як і ты. Няхай ягоныя скажуць...

— А што яны?..

— Ня чуюць. Баяцца, што памрэ.

Вяртаючыся дахаты, вандроўнік у каторы раз намагаўся ўцяміць: хто такі чмель і што такое Бог?.. Калі Бог, — думаў вандроўнік, — у якога чмель ня верыць, усё адно ў чмялі, значыць, Бог ва ўсіх. Як душа, якая і ёсьць чмель, і ёсьць Бог. Які адначасова і паўсюдна ва ўсім гэткім бясконцым, што немагчыма ўявіць, Сусьвеце... Дзе штоімгненна запальваюцца і пагасаюць у нечым лятучым, што ляціць і ўніз, і ўверх і адразу ва ўсе бакі, мільярды мільярдаў зорак, і маленькая лятучая душа роўная ўсяму бясконцаму лятучаму Сусьвету, у якім ад бясконцасьці да бясконцасьці — усё адно ў адным, і ўсё гэта разам і ёсьць Бог...

Мудрасьці, каб падумаць інакш, не хапіла. Вандроўнік зразумеў, што ў тым, пра што падумаў, няма мудрасьці. “Тады дзе яна і ў чым?...”

Выходзіла, што, калі ня ў ім, у вандроўніку, тады ў вандроўным Бозе.

Тут узьнікала праблема...

Богу было не да авадня — і авадзень не памёр. У ім замянілі ўсё аваднёвае на новае, і ён далей застаўся жыць і баяцца памерці...

Чмель памёр у шпіталі ў той дзень, у які некалі пачалася вайна, на якой пражыў ён жыцьцё. Сьвятара ён так і не паклікаў, але Бог, які быў у чмялі, пахаваньне ягонае наладзіў, як сьвята... Было бясконца ціха — сьвятло і дыханьне, і ў сьвятле і дыханьні лunалі белыя сьцягі з чырвонымі сьлядамі крывінак.

I нікога на машынах, каб пыл не ўздымалі...

Вандроўнік ішоў за трунoй і ўспамінаў, як маліў чмяля, калі той памёр, каб падаў які-небудзь знак, што ўсё тое, пра што яны апошнім разам гаварылі, так і ёсьць, і як чмель падаў знак: калі ўсчаўся гвалт і крык, падняў свой зашклёны партрэт, бо абраза не было, і гвазднуў яго аб падлогу, шкло пырскамі ў крык і гвалт разьляцелася: “Сьціхніце!..” I яшчэ згадаў вандроўнік, як пад клавіятурай друкарскай машынкі, якая дасталася яму ад чмяля, знайшоў прыклееную паперынку, на якой чмялём было напісана:

*“Ёсьць першая старонка... З Богам!”*

*Ліпень 2003, Менск.*

# За сьцяной

## *Апавяданьне*

Дзіця за сьцяной плача і плача. Штоночы. Сілішся ня чуць, пад падушкай заціскаеш вушы, але ж хіба засьнеш пад падушкай з заціснутымі вушамі? І ляжыш, утапіўшы ў цьмяную столь вочы, і чуеш, ня хочачы, ня толькі плач дзіцячы, але і ўсё астатняе: як устаюць бацькі, супакойваюць, запальваюць сьвятло, тупаюць на кухню разаграваць поіва, пояць, зноў супакойваюць, па чарзе люляюць і стомлена, раздражнёна вадзяцца, вадзяцца, вадзяцца...

— Ходзіш за ім вечна. Сьліні выціраеш.

— Дык ты ж ня ходзіш.

— І ня буду. За мной не хадзілі.

— Ну і сьпі. Чаго ўстаеш?

— Засьнеш тут.

— Вушы ватай заткні. Ці займей кватэру людскую.

— Кватэру... Мяне з работы хутка пратураць. Цэлымі днямі сонны.

— Я вінаватая?

— А хто? Разбэсьціла. Лялечкі, цацачкі, лыжачку за маму, лыжачку за тату. Я вунь...

— Ты, ты! Скрозь ты. І чым ты ўжо такі лепшы?

— Лепшы ня лепшы, а катаргі гэтакай бацькі ня ведалі. Пад сталом, як сабачаня, на вяроўцы сядзеў, пакуль яны ў полі былі. І нічога, жывы-здаровы.

— І дурны. Толькі і навучыўся пад тым сталом, што гаўкаць...

Спрэчка блізкая да таго, каб перакінуцца ў лаянку, але побач дзіця, нельга, і яны ці сьціхаюць, ці ідуць на кухню, зачыняюць там дзьверы, праз якія ўжо нічога не чуваць.

Раніцой Андрэй сустрэне іх на аўтобусным прыпынку, прывітаецца і, як заўсёды, яму будзе няёмка, што ён ведае пра іх нешта з таго, чаго ня сьлед ведаць старонняму чалавеку. Як заўсёды, сусед будзе з сынам на руках, суседка — з гаспадарчай, у чырвоную клетку, сумкай, яны павітаюцца і разыйдуцца, словам не перакінуўшыся, ледзь знаёмыя людзі — і ня больш.

Раніцой раней за будзільнік зазваніў тэлефон.

— Кватэра Карунскіх?

— Я адзін тут Карунскі... Слухаю вас... Алё...

— Мяне папрасілі перадаць, што бабуля вашая памерла.

— Хто гэта? Хто мне звоніць? — амаль закрычаў Андрэй у трубку, але адтуль чуліся ўжо толькі кароткія гудкі.

Да вёскі Андрэй дабраўся надвячоркам, ледзьве пачало шарэць. Шафёр, раззлаваны сьлізкай, у завеях, дарогай і сваім старэнькім расхліпаным аўтобусам, а найбольш кпінамі вострай на язык маладзіцы, якой ён, можа, і сапраўды памыліўшыся, не дадаў рэшты з грошай за білет, не згадзіўся спыніцца каля дзедавай хаты, і Андрэю давялося ехаць на другі канец вёскі, да канцавога прыпынку. Цяпер ён стаяў на бязьлюднай вуліцы і, прытрымліваючы локцем зялёны, з жоўтымі бляшанымі кветкамі і чорнай стужкаю вянок, ладзіўся прыпаліць цыгарку.

Разам з ім сышла з аўтобуса і тая самая вострая на язык маладзіца. Адразу ж яна хуценька скіравала ўбок магазіна, але ўбачыўшы, што Андрэй цягне за сабою вянок, прыпынілася і, робячы выгляд, што заразважала, ці так ужо ёй той магазін патрэбны, раз-пораз паглядвала на Андрэя. Андрэй ня ведаў яе і не стараўся пазнаць, бо па гаворцы было чуваць, што яна не тутэйшая.

Запалкі ламаліся ў замерзлых пальцах, цыгарка не прыпальвалася, а маладзіца ўсё стаяла, не адыходзіла. Доўга маўчаць яна ня звыкла, таму ня вытрывала:

— Хаваць каго прыехалі?

«Чаго пытацца?.. Нібы не відаць...»

— Хаваць.

— Ці не старую Карунскую?

Андрэй кіўнуў. Карунскіх у Карунах было добрых паўвёскі, таму, калі б нават не ягоная бабуля памерла, то ўсё адно, мабыць, хавалі б старую Карунскую.

— А яе ўчора пахавалі.

— Як гэта ўчора?

— Ды ўчора. Я і на памінках была. Я ў магазіне працую, дык на ўсіх памінках бываю.

«Не пасьпеў!»

— А вы ёй хто?

— Унук.

— А... Казалі, што нехта не прыехаў.

— Мне толькі сёньня пазванілі.

— Хто?

Андрэй прамаўчаў.

— Хто вам пазваніў?

— Што вам да таго?.. — вырвалася ў Андрэя нечаканага для яго самога раздражнёна, і ён ужо спакайней даказаў. — І якая цяпер розьніца...

Маладзіца не пакрыўдзілася.

— То можна цяпер вянок адразу на могілкі несьці. Ці ў хату панясеце, каб паказаць?

Андрэя зьдзівіла, што яна сказала гэта без насьмешкі, зусім сур'ёзна.

— Дзякуй за параду. На могілкі пайду.

— Ведаеце дзе?

— Ведаю.

— Я вам пакажу.

«От жа ліпучая баба! На магілу яшчэ папрэцца...» — прыпаліў нарэшце Андрэй, не спадзяючыся ўжо ад спадарожніцы сваёй адчапіцца, але тут якраз з магазіна на ганак выйшла цётка ў кажусе наросхрыст і закрычала:

— Ніна! Да сьмерці цябе чакаць?

— Пойдзеце наўпрост па вуліцы і вунь там, каля царквы, налева і ўверх, — не павярнуўшы нават галавы на крык, тлумачыла маладзіца. — Тут зусім побач...

— Ды я ведаю, ведаю, дзякуй, — засьпяшаўся Андрэй, а цётка зноў загалёкала:

— Ніна, чуеш! Рэвізор прыехаў, напіўся ўжо, а ты ўсё х... ведае дзе п... носіш!

— А магіла сьвежая там адна, апошнім часам толькі яе і пахавалі, — тараторыла маладзіца ўсьлед Андрэю. — Так што лёгка знойдзеце... А ты чаго маёй чакаеш? — крыкнула яна цётцы. — Свая зарасла?..

Магілу і шукаць не давялося: яшчэ не занесеная сьнегам, яна адна жаўцела сьвежай зямлёй сярод чыстага, белага, нерушнага спакою. Андрэй прыладзіў вянок на крыж, зьняў шапку, пастаяў без аніякіх думак і пасьля ўжо, сабраўшыся пайсьці, прачытаў надпіс, зроблены на габляванай папярэчыне крыжа звычайным хімічным алоўкам: *Т.П.Р.Б. Карунская Галіна Адамаўна.*

«Якая Галіна Адамаўна? Яна ж Гертруда Іванаўна, баба Грудзя... Во даюць!.. — няўцямна глядзеў ён на крыж і раптам зразумеў, аж потам прабіла: — Не яна!..»

Ён азірнуўся наўкол, прайшоў між радамі ў самы канец могілак, да агарожы, вярнуўся назад, зноў прайшоў і вярнуўся: нідзе болей ніводнай сьвежай магілы, адна гэтая — і ўсё. «А, каб на цябе!.. — памянуў ён языкастую маладзіцу і шпарка

пакрочыў, амаль пабег з могілак да вуліцы, да дзедавай хаты, але толькі спусьціўся з пагорка, успомніў: — А вянок?..” Гэтак жа подбегам, задыхана падняўся на пагорак, крадком, нібы той злодзей, падышоў да магілы, зьняў вянок з крыжа — магіла адразу стала пустой і сіроцкай. З вянком Андрэй ня стаў спускацца да вуліцы, рушыў цераз могілкі і далей напрасткі па цаліку, па калені правальваючыся ў сьнег. Адышоўшыся, яшчэ раз азірнуўся: акрамя яго, дзякуй Богу, ніводнай жывой душы на могілках не было.

Дзеда ўбачыў здалёк, з-за прысадаў на ўзьмежку. З рэзьгінамі на плячы дзед ціхаціха сунуўся ад хаты да гумна, Андрэй гукнуў: «Дзед!..» Той павярнуў галаву на голас, але хады не паскорыў — ці то не пазнаў Андрэя ў прыцемках, ці то гэтак стаміўся, што і пазнаць нікога ня мог. Самому ж — каму яшчэ? — давялося, мусібыць, і труну майстраваць, і з папом дамаўляцца, і пра хаўтуры думаць: немалы клопат — як мае быць пахаваць чалавека. Андрэй прыпусьціў кроку, і якраз каля гумна яны і сышліся: дзед з рэзьгінамі, унук з вянком.

— Скуль гэта ты? — не вітаючыся, хоць не бачыліся гады чатыры, спытаў дзед і, спытаўшы, закашляўся, адвярнуўся ўбок і кашляў суха, адрывіста, доўга... — От халера нейкая...

Абняцца замінаў вянок, і ўсё ж Андрэй няўклюдна прыабняў дзеда левай рукой, торкнуўся тварам у сьсівелую шчаку, раптам наплылі сьлёзы, запяршыла ў горле: «Здароў, дзед... Ты трымайся, трымайся...»

— Трымаюся. Памажы сена накідаць.

Андрэй расчыніў рыпучыя дзьверы гумна, зьняў вянок з пляча і, ня ведаючы, куды яго прыткнуць, павесіў на ручку сячкарні.

— Каму ты гэта?

— Нябожчыцы, каму.

— А... Ты хіба яе помніш?

— Ты што, дзед?.. Не крыўдуй ты. Часу ўсё не было. Круцішся там, бегаеш, а чаго круцішся, чаго бегаеш — чорт яго ведае.

— Я не крыўдую, ты чорта ня згадвай... Добра, што помніш. Яна мне сястра стрыечная, то і табе радня нейкая.

Сена на таку было ўсяго нічога, Андрэй палез на гарышча, каб скінуць пару бярэмкаў, ды так і застыў на драбіне. Насьцярожана глянуў уніз на дзеда.

— Хто табе сястра?

— Стрыечная, кажу. Гэля Карунская. Яна ў дзеўках Бельскай была, а ў бабах, бач, Карунскай стала. Хоць мужык яе і не з Карун, і не радня нам аніякая. Прозьвішчы толькі адны і тыя ж.

Андрэй павярнуўся і сеў на драбіне, каб не зваліцца. Блізка было да таго, што ён са сваім вянком прыехаў ранавата, трапляючы з адной дурноты ў другую. Таму спытаўся ў абход:

— А бабулі яна хто?

— Праз мяне і ёй радня выходзіць.

— Выходзіла, а не выходзіць.

— У нас так не кажуць, забыўся ты... Радня і па сьмерці раднёй застаецца. Сам чалавек — лісток, галінка, а ўсё ў ім ад радні, ад кораня ідзе. І памірае чалавек не ў сваю сьмерць, а калі корань высыхае. Ты лезь, чаго сеў?

— Зараз.

— І далей пралазь, цягні з куткоў ад шчыта, з крайку я і сам накідаю.

Андрэй залез на гарышча, бокам, паўзком па сене стаў прабірацца ў кут да шчыта і балюча ўдарыўся каленам аб вугал нейкай скрыні. Войкнуў з нечаканкі:

— Ты б сказаў, што ў цябе тут скрыня.

— Ня скрыня. Дамавіна. Іх там дзьве.

— Нашто?

— На сьмерць, на што ж яшчэ. Зладзіў сабе і старой, каб людзям пасьля лішняй работы ня мець. Сухія будуць, цёплыя.

— Так... І хто з вас першы паміраць зьбіраецца?

— Як выйдзе. Яно нікому ня доўга. Памыўся, апрануў кашулю чыстую, памаліўся — і памёр. Сілы ўжо ня тыя.

— А бабуля?..

— Што бабуля?

— Ну, як яна?..

— Сена кідай! — узлаваўся раптам дзед. — Бабуля, бабуля... Скаціне трэба даваць!..

— Дык жывая яна, ці не? — вырвалася нарэшце ў Андрэя тое, пра што ўжо і пытацца не было патрэбы.

— Жывая, калі карова не ўбадала. Як даіць, так стой і за рогі яе трымай. Мелі карову, як карову, дык не, прычапілася: давай ды давай цялушку ў Шчапкоў купім. Купілі на сваю галаву! І на пашы яе, як пчалу тую, не ўтрымаць, і ў хляве з ёй ня ўправіцца. Купіла! Сама купіла, а цяпер на мяне... Я вінаваты! А як жа, хто ж яшчэ... А калі я піў тое малако? Ня піў і ня п'ю, у мяне ад яго жывот гуляе. Каб хоць сама піла. Кубак з усяго вып'е, астатняе здаваць бегае. Грамату ёй паабяцалі. Чуеш, усё ў яе ёсьць, адно граматы не стае. Як здурнела пад старасьць... Была ў горадзе, дык і рамку пад тую грамату купіла. Пабачыш, вісіць над ложкам. Я туды Хрыста ўставіў, у бацюшкі выпрасіў — вырвала. Рамка пустая, а Хрыстос у куце на цьвічках. Ну ці ня дурасьць? Я і плюнуў, хай адна доіць, сама сабе грамату зарабляе... Трасеш ты сена ці не?

— Ёрш тваю дваццаць, — толькі і змог сказаць Андрэй, па-дурному рагатнуўшы. — Дзед... Гэта і ўся трагедыя? Дык мы ёй, карове той, рогі абломім! Яна ў нас шоўкавая стане!

— Ну-ну, — уздыхнуў дзед. — Абламі.

Бабуля ўбачыла яго і заплакала. Пасьля кінулася ў складзік, прынесла глечык сырадою. Андрэй, каб не пакрыўдзіць, выпіў шклянку, другую, дзед глянуў на яго і паморшчыўся:

— Ну-ну.

— Чаго ты нукаеш? Чаго разнукаўся? — адразу ўзялася ўбокі бабуля. — Нук на цябе напаў?..

«Яшчэ якая жывая, — зусім павесялела Андрэю. — От бы яна мяне з вянком турнула!»

Колькі Андрэй сябе помніў, бабуля заўжды была такой: ніколі і нікому слова не спускала. І не па злосьці ў характары, не па скандальнасьці натуры, не: проста нічога ў жыцьці не магла яна ўспрымаць безасабова, безадносна да сябе. Ня толькі тое, што адбывалася ў яе хаце, у суседзяў, у вёсцы, а ўсё, што здаралася ў сьвеце і пра што яна даведвалася, мела нейкія адносіны да яе асабіста, на ўсё яна ўскідвала рукі і пыталася: «А што ж я цяпер рабіць буду?..» Гэтае пытаньне бабуліна даўно хадзіла па вёсцы, як прымаўка. Ці нечая кватухa на яйках сядзець не хацела, ці кілу суседу выразалі, ці малатарня ламалася, ці недзе землятрус гарады бурыў, ці карабель тануў, ці самалёт падаў — нехта, пачуўшы навіну, абавязкова возьме ды скажа: «Што ж цяпер баба Грудзя рабіць будзе?..»

А яна рабіла. Першая бегла памагчы, паспачуваць, параіць... Высільвалася, хоць мела ўжо пенсію, на калгаснай ферме, аддавала — летам, калі трохі лягчэй было — пенсію сваю ў Фонд міру і нават напісала (падбіўшы на гэта, каб граматна скласьці, сельсаветаўскую сакратарку) ліст прэм'ер-міністру Англіі, жалезнай ледзі Тэтчэр.

«Што ж гэта?.. Баба дзетная — і ў адну дудку з амерыканцамі пра вайну трубіць. Падказаць няма каму, каб падумала...»

Аднаго разу — не праз ліст у Англію, на які не дачакалася адказу, а праз прымаўку бабуліну — праславілі яе ў газеце. Пісалі, зрэшты, не пра яе, і наогул напісанае фельетонам называлася, пісалі пра нейкую прыдуманую бабу Грудзю, якая нібыта надта ж любіла лён церабіць, валакно трэсьці і кудзелю прасьці, ды з таго прадзіва белае палатно ткаць, а любіла ўсё гэта яна, як аказалася, дарэмна, бо ў калгасе, дзе ўсё гэта яна так любіла, лён сеяць узялі ды пераcталі. І ня стала чаго беднай бабе ні церабіць, ні трэсьці, ні прасьці, ні ткаць. «Што ж цяпер баба Грудзя рабіць будзе?..» — напрыканцы фельетону, як і ў назве ягонай, пытаўся журналіст, і з усяго гэтага толькі адно вынікала: панесла па сьвеце прымаўку пра бабу Грудзю, як вецер насеньне носіць.

— Ведаў бы работу тую, то не пытаўся б, — казала на славу сваю бабуля, але фельетон з газеты выразала і на шафу паклала. Там лісьцік газетны, жаўцеючы, і сох разам з мятай і сьвятаянкамі, плакуном і дужэцам, сардэчнікам і дзівасілам...

— А ён табе вянок прывёз, — раптам бахнуў дзед, які ў хвіліну адкрытай ласкавасьці ўнука да бабулі аказаўся адзін супроць дваіх.

— Які вянок?

— Апошні. Дамавіна даўно гатовая, так што пара. Намыкаўся я з табой. Чаю зноў не паставіла?

У Андрэя патыліца пахаладзела.

— Ну і жарты ў цябе, дзед...

— Здурнеў пад старасьць, — абыякава сказала бабуля.

— Не здурнеў! Каторы дзень кадыхаю — хоць бы хто пачуў, — не здаваўся дзед. — Толькі цягайся ды цягайся, ды ўсё на марозе, бадай на яго...

— Сядай вячэраць ужо, — голасам змоўшчыцы, так, як толькі яна адна і ўмела, калі хацела, гаварыць, сказала бабуля. — Зрабіла я табе твайго чаю.

І дзед абмяк.

— Сказала б адразу... А то драцяны нейкі кашаль, нутро ўсё падраў...

Пасьля вячэры Андрэй з бабуляй націралі дзеда гарэлкай, захутвалі ў коўдры і аўчыны, паілі травяным чаем. Ноччу дзед спаў спакойна, амаль ня кашляў.

Досьвіткам Андрэй прачнуўся і першае, што ўбачыў — вянок. «Дзед!» — мільгнула спрасонку думка.

— Дзед! — галяком кінуўся Андрэй у дзедаву бакоўку, але ложак там быў пусты, засьцелены, Андрэй выскачыў на кухню: «Дзед!..» — і ўбачыў іх абаіх: бабуля таўкла паранку, а дзед падліваў у саган ваду і аж вядро ўпусьціў з перапуду.

— Чаго ты?

— Фу ты! — выдыхнуў Андрэй. — Нічога, сон дурны падняў.

— Бо вянок у гумне пакінуў, — падняўшы вядро, сказаў дзед. — І я, як на грэх, забыўся... Нічога нябожчыцкага пры сене не пакідай: на сене сын Божы нарадзіўся. От табе і сон паганы. Добра, што старая па вянок схадзіла, а то горш магло быць.

— Мышы там з пацукамі, таму я і прынесла, каб ня згрызьлі, — таксама трохі спуджаная Андрэевым крыкам, сказала бабуля. — Толькі не туды паставіла... І ні прычым тут сын Божы, — набрала яна голас на дзеда. — З нерваў яны крычаць, гарадскія.

— Можа, і з нерваў, — згадзіўся дзед.

— А, можа, і не, — і з ім, і сама з сабой не згадзілася бабуля.

Дзед сумеўся.

— З чаго ж тады?

— З таго, што глухіх стала шмат. Ня крыкнеш — не пачуюць.

— Я хутка... Я зараз жа яго... — страсянуў галавой Андрэй і пайшоў апранацца.

— Хай пастаіць, пасьнедаем і пойдзеш!.. — пакрыквала ў адчыненыя дзьверы бабуля. — Гэта добра, што ты прывёз яго. Бо ейныя якраз не прыехалі...

— Хто ейныя?

— А ты іх ці ведаеш... Над ложкам картка ў рамцы вісіць. Як тым летам прыязджалі — мы ўсёй раднёй і зьняліся. Цябе толькі і не было.

— Дзед, ты ж казаў, што рамка пустая.

— Пустая была, пакуль яна картку ня ўставіла.

Андрэй падышоў да фотаздымку. На ім — ён пералічыў — сядзелі і стаялі амаль два тузіны ягонай радні, з якіх ён нават паловы ня ведаў. І сярод гэтых незнаёмых ці забытых людзей, якія былі яму хай ня роднымі, але ўсё ж братамі і сёстрамі, былі пляменьнікамі і пляменьніцамі, дзядзькамі і цёткамі, Андрэй, спачатку самому сабе не паверыўшы, убачыў і пазнаў сваіх гарадскіх суседзяў: ён, як заўсёды, з сынам на руках, а яна з гаспадарчаю сумкай...

— Бабуля! — паклікаў Андрэй, і калі тая падыйшла, спытаўся. — Гэтыя во, з малым, хто такія?

— Яны і ёсьць, нябожчыцы ўнук якраз. Жонка ягоная ня з нашых, аднекуль з-пад Воршы ўзяў, як у войску служыў. Дзеўка ладная, адно згуляная. Яны ўсе згуляныя з таго боку.

— Як яго зваць?

— Толікам, здаецца... Стары! — гукнула яна дзеда. — Гэльчынага ўнука меншага Толікам зваць?

— Толікам.

— Во, бачыш, не забылася, — працерла картку, ручнік з шафы дастаўшы, бабуля, а Андрэй спытаўся:

— А прозьвішча?

— Ото дажыліся, — буркнуў дзед. — Карунскі, як і ў цябе, якое ў яго яшчэ прозьвішча можа быць...

На могілкі пайшлі, трохі затрымаўшыся, бо трэба было надпіс на вянку падправіць: *Бабулі Грудзе ад унука*. Бабуля нажніцамі выстрыгла сваё імя і акуратна сшыла чорную стужку чорнымі ніткамі. «Во, як новая, — сказала яна. — Ніхто і не падумае нічога. *Бабулі ад унука*». Кавалак стужкі са сваім імем яна загарнула ў паперчыну і паклала на шафу, дзе жаўцеў фельетон, сохлі мята і дужэц, дзівасіл і сьвятаянкі.

Вечарам, прытупаўшы да аўтобуса, Андрэй убачыў на прыпынку Ніну, тую самую маладзіцу, з якой учора ехаў з гораду.

— На турму недастачу налічыў! — замест прывітаньня выпаліла маладзіца. — На мордзе ў самога напісана, што жулік, а мяне судом страшыць! Мы да яго, п’янага ў каноплі, абедзьве і перадам, і задам, а ён хрэн у портках знайсьці ня можа! Хрэну не знайшоў, а недастачу знайшоў, чуеш?.. Ну калі ўжо гэта праўду праўдзівыя людзі знойдуць, скажы ты мне?.. Як жыць на сьвеце?.. Што баба Грудзя рабіць будзе?..

*Ліпень 1980, Крэва.*